ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *РЭЦЭНЗІІ*

***REVIEWS***

Паступіў у рэдакцыю 14.01.2025
https: //doi.org/10.29235/2524-2369-2025-70-2-160-162 Received 14.01.2025

**М. М. Мязга**

*Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, Гомель, Беларусь*

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ЗНЕШНЕПАЛІТЫЧНАЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ МІЖВАЕННАГА ЧАСУ

У 2024 г. убачыла свет манаграфія вядучага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАН Беларусі В. М. Бароўскай «Беларусь у савецка-польскіх адносінах (сакавік 1921 – люты 1939 г.)» (Мінск: Беларуская навука, 2024. – 303 с.). Гэта ўжо не першае манаграфічнае выданне названага аўтара, які працягвае паспяхова займацца даследаваннем знешнепалітычнай гісторыі Беларусі. В. М. Бароўская звярнулася да праблемы месца і ролі Беларусі ў савецка-польскіх адносінах міжваеннага перыяду. Улічваючы ўплыў Рыжскага дагавора, адносін паміж Савецкай дзяржавай і Польшчай на гісторыю беларускай дзяржаўнасці, сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё беларускіх зямель у 1920–1930-я гг., сучасную міжнародную абстаноўку, актуальнасць тэмы даследавання, якой прысвечана манаграфія, не выклікае сумненняў. Адзначым таксама, што праблема ролі і месца Беларусі ў адносінах паміж СССР і Польшчай адносна нядаўна з'явілася прадметам вывучэння айчыннай гістарыяграфіі і мае патрэбу ў далейшым глыбокім даследаванні з прыцягненнем новых гістарычных крыніц і, адпаведна, увядзеннем у навуковы ўжытак новага фактычнага матэрыялу. Гісторыкам, якія займаюцца дадзенай праблематыкай, на сённяшні дзень неабходна больш актыўна звярнуцца да абагульнення назапашанага ў гістарыяграфіі матэрыялу. Манаграфія В. М. Бароўскай з'яўляецца укладам у вырашэнне гэтых задач.

Даследаванне грунтуецца на глыбокім веданні яго аўтарам гістарыяграфіі праблемы і аналізу шырокага комплексу гістарычных крыніц. В. М. Бароўская вызначыла этапы развіцця савецкай гістарыяграфіі, устанавіла адрозненні ў падыходах да даследавання савецка-польскіх адносін у савецкай і постсавецкай гістарыяграфіі. Прадстаўлены і асноўныя канцэпцыі польскай гістарыяграфіі па тэме манаграфіі. Што тычыцца комплексу гістарычных крыніц, на якіх засноўваецца даследаванне, то адзначым перш за ўсё шырокае прыцягненне архіўных матэрыялаў, значная частка якіх упершыню прадстаўлена ў навуковых даследаваннях. Можна парэкамендаваць аўтару ў далейшых даследаваннях больш актыўна выкарыстоўваць крыніцы, прадстаўленыя ў найноўшых публікацыях дакументаў (Dokumenty do historii stosunków polsko-soweckich. 1918–1945: w 2 t. – Warszawa: Centrum polsko-rosyjskiego dialogu i porozumienia, 2020; Савецка-польскія адносіны ў 1918–1945 гг.: зборнік дакументаў: у 4 т. / пад агул. рэд. М. М. Нарынскага, А. В. Мальгіна. – М.: Аспект Прэс, 2017), а таксама публікацыі матэрыялаў Палітбюро ЦК УКП(б). У цяперашні час даступны дакументы ў электронным выглядзе Расійскага архіва сацыяльна-палітычнай гісторыі, што таксама дазваляе пашырыць корпус крыніц па тэме даследавання.

Праблемнае поле, якое вызначыла В. М. Бароўская для свайго даследавання, ахоплівае ўсе асноўныя сферы ўзаемадзеяння паміж савецкімі рэспублікамі і Польшчай у міжваенны час. У манаграфіі роля і месца Беларусі ў савецка-польскіх адносінах разглядаюцца ў некалькіх ракурсах. Па-першае, ахарактарызавана палітыка Масквы і Варшавы ў адносінах да БССР, Заходняй Беларусі, беларускага нацыянальнага руху. Далей аўтар паказвае, як дадзеная палітыка адбівалася на характары савецка-польскіх адносін у цэлым. Яшчэ адзін аспект – гэта ўдзел БССР у кантактах з Польшчай як у перыяд фармальнай незалежнасці да ўтварэння СССР, так і ў яго складзе. Тым са-

мым фарміруецца заяўлены аўтарам сістэмны падыход да вывучэння ролі і месца Беларусі ў савецка-польскіх адносінах міжваеннага перыяду.

У манаграфіі справядліва адзначаецца, што міжнародна-прававую аснову савецка-польскіх адносін у міжваенны перыяд ствараў Рыжскі дагавор. Паказаўшы, што падзел Беларусі стаў асновай савецка-польскага кампрамісу ўжо пры падпісанні прэлімінарнага дагавора, аўтар дэталёва прасочвае выкананне Рыжскага дагавора. Пры гэтым паказваецца, у якой ступені гэты працэс закранаў Беларусь. Разглядаючы дзейнасць створаных у адпаведнасці з мірным дагаворам змешаных камісій, В. М. Бароўская акцэнтуе ўвагу на іх узаемадзеянні з уладамі БССР. Аўтар выявіла спецыфіку БССР у кантэксце падпісання і выканання Рыжскага дагавора: прадстаўнікі рэспублікі не ўдзельнічалі ў перамовах, не падпісвалі дагавор, яе органы ўлады яго не ратыфікавалі, але палажэнні Рыжскага міру ў поўнай меры распаўсюджваліся на БССР. Найважнейшае міжнароднае значэнне дагавора для беларускай дзяржавы В. М. Бароўская справядліва бачыць у тым, што ён надаваў БССР статус суб'екта міжнародных адносін. Прааналізаваўшы спробы польскага ўрада ўсталяваць непасрэдныя кантакты з уладамі БССР і адкрыць дыпламатычнае прадстаўніцтва ў Мінску, ахарактарызаваўшы ўзаемаадносіны змешаных камісій з яе дзяржаўнымі структурамі, аўтар прыходзіць да высновы, што Савецкая Беларусь фактычна мела правы аўтаноміі ў складзе РСФСР і не магла праводзіць самастойную знешнюю палітыку. А пасля ўтварэння СССР усе знешнепалітычныя функцыі перайшлі да Саюза. У манаграфіі паказана, што пры такой сістэме мелі месца факты ігнаравання цэнтрам інтарэсаў рэспублікі на міжнароднай арэне. Для процідзеяння гэтай тэндэнцыі кіраўніцтва БССР, у прыватнасці, дамагалася прызначэння ў шэраг савецкіх прадстаўніцтваў за мяжой сваіх упаўнаважаных. Высокай ступенню навуковай навізны адрозніваецца матэрыял, які характарызуе дзейнасць польскага консульства ў Мінску.

Істотнае месца ў манаграфіі адведзена барацьбе Польшчы і Савецкай дзяржавы за ўплыў у Заходняй Беларусі. Даказана важнае значэнне гэтага рэгіёна для геапалітычнага становішча Польшчы, што абумовіла правядзенне ёю палітыкі асіміляцыі з мэтай трывалай інтэграцыі яго ў склад Польскай дзяржавы. Савецкая палітыка ў адносінах да Заходняй Беларусі справядліва прадстаўлена як нацэленая на аслабленне пазіцый Польшчы і заваёву сімпатый мясцовага насельніцтва. Інструментамі для дасягнення гэтай мэты аўтар вызначыла арганізацыю Масквой партызанскага руху, падтрымку антыпольскіх рухаў і арганізацый, выступленне ў абарону правоў беларускага насельніцтва па дыпламатычных каналах. В. М. Бароўская паказала, што ў другой палове 1920-х гг. на змену савецкім афіцыйным пратэстам супраць рэпрэсіўнай палітыкі Польшчы ў Заходняй Беларусі прыходзяць выступленні грамадскіх арганізацый, у тым ліку і БССР. Што датычыцца садзейнічання антыпольскаму руху, аўтар прыводзіць шматлікія факты кадравай падтрымкі Масквой і Мінскам КПЗБ, яе фінансавання. У манаграфіі прадстаўлены цікавы матэрыял, які паказвае працэс пераправы ў Польшчу людзей, фінансаў, літаратуры. Пагадзімся з высновай аўтара, што ўплыў БССР на развіццё камуністычнага руху ў Заходняй Беларусі не быў вызначальным, але без падтрымкі з савецкага боку ён не дасягнуў бы такога размаху.

З савецка-польскім супрацьстаяннем у Заходняй Беларусі В. М. Бароўская абгрунтавана звязвае і савецкую нацыянальную палітыку ў БССР, у прыватнасці, стаўленне да польскай нацыянальнай меншасці. Яна паказала, што і вяртанне ў склад БССР усходніх беларускіх этнічных тэрыторый у 1924 і 1926 гг. было шмат у чым звязана са знешнепалітычным фактарам. У кантэксце польска-савецкага супрацьстаяння на беларускіх землях вывучаецца і палітыка ўлад БССР у адносінах да беларускай эміграцыі. Яе наяўнасць разглядалася як фактар патэнцыяльнай дэстабілізацыі сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў БССР, дыскрэдытацыі яе статусу як беларускай нацыянальнай дзяржавы. У сувязі з гэтым вялікія намаганні афіцыйным Мінскам прыкладаліся для ліквідацыі арганізацый беларускага замежжа, ад якіх магла зыходзіць пагроза савецкай уладзе ў Беларусі, для прыцягнення беларускіх дзеячаў на свой бок. У цэлым, як паказана ў манаграфіі, дадзеная палітыка была паспяховай.

У манаграфіі закранаецца і такі аспект савецка-польскіх адносін, як рэпатрыяцыя, персанальны абмен, аптацыя. Гэтыя пытанні непасрэдна датычыліся насельніцтва як БССР, так і Заходняй Беларусі. Па дадзенай праблематыцы прыведзены шырокі арыгінальны фактычны матэрыял. Тое ж можна сказаць і пра рээвакуацыю з тэрыторыі савецкіх рэспублік матэрыяльных каштоў-

насцей у адпаведнасці з Рыжскім дагаворам. У манаграфіі адзначаны цікавыя факты, калі кіраўніцтва БССР спрабавала сабатаваць рашэнні змешанай рээвакуацыйнай камісіі і ўхіляцца ад перадачы маёмасці Польшчы. Паказана роля вучоных БССР у спробах даказаць неабгрунтаванасць польскіх прэтэнзій на атрыманне культурных каштоўнасцей.

Разглядаючы савецка-польскія перамовы пра дагавор аб ненападзенні, якія пачаліся з 1925 г., аўтар зрабіла абгрунтаваную выснову, што значэнне беларускага пытання ў польска-савецкіх адносінах на той момант знізілася. У прыватнасці, СССР не збіраўся дамагацца ўключэння ў дагавор палажэння аб правах нацыянальных меншасцей. З імкненнем СССР заключыць дагавор аб ненападзенні з Польшчай аўтар звязвае аслабленне антыпольскага акцэнту ў савецкай прапагандзе з канца 1920-х гг., у тым ліку і ў БССР. Цалкам абгрунтаваным уяўляецца і выснова В. М. Бароўскай, згодна з якой савецкі ўрад праз дагавор аб ненападзенні фактычна заяўляў пра намер устрымлівацца ў далейшым ад выкарыстання нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне для развалу Польскай дзяржавы.

У манаграфіі разгледжаны намаганні СССР і Польшчы да падпісання гандлёвага дагавора. Аўтар здолела вызначыць асноўныя праблемы, якія доўгі час перашкаджалі дасягненню пагаднення: савецкая манаполія знешняга гандлю, выкананне матэрыяльных абавязацельстваў, прадугледжаных Рыжскім дагаворам, невялікая роля Польшчы як знешнеэканамічнага партнёра СССР.

Значную навуковую цікавасць уяўляе матэрыял манаграфіі, які характарызуе гандаль БССР з Польшчай. В. М. Бароўская прапанавала аўтарскую перыядызацыю гісторыі гандлёвых адносін паміж імі ў міжваенны перыяд. Яна паказала, што асноўнай тэндэнцыяй іх развіцця стала згортванне з часам прамых кантактаў беларускіх вытворцаў з польскімі партнёрамі. А ў 1930-я гг. можна адзначыць толькі ўдзел рэспублікі ў агульнасаюзным гандлі з Польшчай з поўным знікненнем у ёй элементаў самастойнасці Мінска. Дастаткова грунтоўна ў манаграфіі раскрыты ўдзел БССР у навуковым і культурным абмене з Польшчай, які працягваўся на працягу 1920–1930-х гг. Аўтар зрабіла абгрунтаваную выснову, што галоўнай перашкодай на шляху актывізацыі навуковых і культурных кантактаў паміж БССР і Польшчай з'яўлялася розніца ў грамадска-палітычным ладзе.

Апраўданым уяўляецца зварот аўтара ў дадзенай манаграфіі да праблемы савецкай палітыкі, нацэленай на стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе, паколькі яе рэалізацыя магла паўплываць на міжнароднае становішча Беларусі. На наш погляд, некалькі спрошчаным з'яўляецца прадстаўленае ў манаграфіі палажэнне, згодна з якім гэтая палітыка дыктавалася выключна імкненнем Масквы захаваць мір у Еўропе і ва ўсім свеце. У СССР былі свае дзяржаўныя інтарэсы, дасягненню якіх павінна была служыць і палітыка калектыўнай бяспекі. В. М. Бароўская фактычна гэта прызнае, калі піша пра імкненне Савецкага Саюза змяніць міжнародны парадак, усталяваны Версальскай сістэмай праз падпісанне Усходняга пакта, які мог стварыць умовы для тэрытарыяльных змен ва Усходняй Еўропе. Аўтар пераканаўча паказала нежаданне Польшчы ўдзельнічаць у сістэме калектыўнай бяспекі.

На наш погляд, манаграфія выйграла б у навуковым плане, калі б аўтар некалькі змяніла акцэнт у сваім даследаванні за кошт фактalогіі на карысць аналізу і абагульнення. Частка выкладзеных у манаграфіі фактаў ужо прысутнічае ў гістарыяграфіі, таму можна было ў большай ступені засяродзіцца на тэарэтычным узроўні даследавання, на тлумачэнні тых працэсаў, якія адбываліся ў польска-савецкіх адносінах у міжваенны перыяд і вызначалі месца ў іх Беларусі. У цэлым манаграфія, падрыхтаваная В. М. Бароўскай, з'яўляецца істотным укладам у вывучэнне знешнепалітычнай гісторыі Беларусі. Выкладзены ў ёй матэрыял адрозніваецца значнай ступенню навуковай навізны, аб'ектыўнасцю і дакладнасцю, што з'явілася ў першую чаргу вынікам скрупулёзнага аналізу аўтарам шырокага кола гістарычных крыніц.

**Информация об авторе**

**Мезга Николай Николаевич** – доктор исторических наук, профессор, заведующий кафедрой всеобщей истории. Гомельский государственный университет им. Ф. Скорины (ул. Советская, 104, 246028, Гомель, Республика Беларусь). E-mail: miazgamm65@gmail.com

**Information about the author**

**Mikalai M. Miazga** – D. Sc. (Hist.), Professor, Head of the Department of general history, F. Skorina Gomel State University (104 Savieckaja Str., Gomel 246028, Belarus). E-mail: miazgamm65@gmail.com